СУСТРЭЧЫ




# «ВЫХАД У СВЕТ» ПА-МАЛАДЗЁЖНАМУ

**ЛІДА. 15 чэрвеня ў краме «Книжный мир» горада Ліда адбылося чарговае пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет» з удзелам лідскіх пісьменнікаў і гасцей з Гродна. Да праекта далучыліся маладыя гродзенскія літаратары Вольга Алізар і Андрэй Дарожкін.**

Нагадаем, што крама «Книжный мир» у горадзе Ліда з'яўляецца адзінай на сённяшні дзень гандлёвай кропкай у Гродзенскай вобласці, дзе рэгулярна праходзяць літаратурныя мерапрыемствы. Ініцыятары такой патрэбнай і карыснай справы – ужо вядомыя Гродзенскім аматарам літаратуры паэты Святлана і Руслан Півараравы. За час супрацоўніцтва па запрашэнні лідскіх калег у літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет» паспелі пабываць і прадэманстраваць сваю творчасць пісьменнікі з Гродна: Кацярына Каламійцава, Антаніна Нурэтдзінава, Ірына Салата, Эла Едэшка, Алена Марынец, Юлія Мельнік. Характэрная асаблівасць сустрэч у галоўнай кнігарні Ліды – выступленні пераважна малавядомых аўтараў, адкрыццё новых імёнаў.



Як адзначыў пастаянны ўдзельнік мерапрыемстваў у Лідзе, намеснік старшыні Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт, публіцыст, літаратурны крытык Дзмітрый Радзівончык, прыярытэтным напрамкам дзейнасці абласной пісьменніцкай арганізацыі з'яўляецца праца з моладдзю. Пра пішучую моладзь на Гродзеншчыне ніколі не забываюць. Новым этапам маладзёжнага напрамку стаў нядаўна арганізаваны ГрАА СПБ абласны семінар маладых літаратараў Гродзеншчыны. Выступленне ў Лідзе двух маладых творцаў, удзельнікаў семінара таксама знаходзіцца ў рэчышчы моладзевай палітыкі Саюза пісьменнікаў Беларусі.




**Вядучы імпрэзы, арганізатар літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет», паэт Руслан Піваварaў (Ліда)**






**Андрэй Дарожкін і Вольга Алізар (Гродна)**

І вось літгасцёўня пачынае работу, перад калегамі з Ліды выступаюць госці з Гродна: паэт, празаік, драматург Андрэй Дарожкін і паэтэса Вольга Алізар. …Андрэй: валодае шырокімі кампетэнцыямі ў галіне тэорыі і гісторыі мастацтва, сусветнай мастацкай культуры; сумяшчае літаратурную творчасць

з навуковай дзейнасцю, рыхтуе да абароны кандыдацкую дысертацыю па культуралогіі. Лаўрэат шматлікіх рэспубліканскіх літаратурных конкурсаў. Аўтар шэрагу публікацый у рэспубліканскай перыёдыцы. Пераможца IV Нацыянальнага літаратурнага стартапа, чакае выхаду дэбютнай кнігі ў адным з дзяржаўных выдавецтваў. Паэт-філосаф і ў той жа час рамантык. Акрамя паэзіі, стварае празаічныя творы і п’есы. Піша па-беларуску і па-руску. …Вольга: аўтар дэбютнага зборніка лірыкі «О тебе, моя милая Родина», лаўрэат шматлікіх літаратурных конкурсаў, член Міжнароднага саюза рускамоўных пісьменнікаў, тым не менш, піша і на беларускай мове. Асноўныя матывы лірыкі – любоў да роднай зямлі і да чалавека, пачуццёвасць, духоўнасць, повязь эпох, пошук гармоніі ў няпростым сучасным свеце. Вобразы, якія ўвасабляе паэтэса ў творах, – вобраз сучаснай жанчыны, маці, Радзімы. Вольга – маці траіх дзяцей.

Адметнасцю ўсіх літаратурных мерапрыемстваў у Лідзе з’яўляецца сяброўская, добразычлівая атмасфера. Але сталенне, узбагачэнне вопытам прадугледжваюць і знаёмства з творчым жыццём ва ўсёй яго разнастайнасці, дзе, як вядома, далёка не ўсе дарогі пасыпаныя пялёсткамі руж. Дыялог пакаленняў, які адбыўся ў рамках пасяджэння літаратурнай гасцёўні з красамоўнай сімвалічнай назвай «Выхад у свет», пацвердзіў важнасць работы па выхаванні новых пакаленняў літаратараў. А маладыя калегі, у сваю чаргу, прадэманстравалі высокі творчы патэнцыял.

Таксама ў праграме літаратурнага мерапрыемства выступілі: паэтэсы Людміла Русь, Ала Юшко, Алена Несцерава, Вольга Верасняк, Ганна Рэлікоўская, Таццяна Сямёнава і Святлана Півоварава; паэты Руслан Піваварaў (віншуем з выхадам новага зборніка), Валерый Мацулевіч і Ігар Вербавік, гродзенскі паэт Дзмітрый Радзівончык; ветэран педагагічнай працы Васіль Гаргуль; былая дырэктар крамы «Книжный мир» Галіна Аляксандраўна Станевіч. Асноўнымі тэмамі выступленняў сталі: тэма Перамогі савецкага народа над фашызмам, 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, тэма мастацтва, 225-годдзе з дня нараджэння А. С. Пушкіна, 90-годдзе ўтварэння Саюза пісьменнікаў Беларусі. Гаспадары падзяліліся ўражаннямі ад выступлення гасцей, выказалі моладзі свае шчырыя пажаданні і сяброўскія парады. Мір, адзінства і згода, стваральная праца – вечныя каштоўнасці, сакральныя паняцці, якімі вызначаюцца ідэйная аснова айчыннай літаратуры і шляхі яе развіцця. У Гродне і Лідзе мы крочым гэтымі шляхамі ўжо не адны. Побач – дастойная змена.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ

**На фота:** у кнігарні «Книжный мир» адбылося пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «Выхад у свет» з удзелам маладых пісьменнікаў з Гродна Андрэя Дарожкіна і Вольгі Алізар. Ліда, 15 чэрвеня 2024 года.






**Кветкі і сувеніры – ад арганізатараў праекта**







**Падзяка – аднаму з пачынальнікаў справы, былому дырэктару крамы «Книжный мир» Г. А. Станевіч**


Людміла Русь


Ала Юшко


Валерый Мацулевіч


Вольга Верасняк



Таццяна Сямёнава



Алена Несцерава



Ігар Вербавік



Святлана Піваварава



**Васіль Гаргуль**



**Дзмітрый Радзівончык**



**Руслан Піваварaў**



**Ганна Рэлікоўская**


Класіка
Паэзія




Сучасная
проза
Замежная
А. Волков
ВОЛШЕБНИК ИЗУМРУДНОГО ГОРОДА
С. Михалков




**Ля Дома-музея вядомага заходнебеларускага паэта Валянціна Таўлая**



**Ля муроў Замка Гедыміна**





**Фота**
*Дзмітрыя Радзівончыка, Андрэя Дарожкіна, Святланы і Руслана Піваваравых*